*Алег Трусаў*

# КАФЛЯНЫЯ ПЕЧЫ БЕЛАРУСКІХ ЗАМКАЎ

Ужо з XIV ст. жылыя памяшканні замкаў і палацаў пачалі ацяпляць кафельнымі печамі. У інвентарах XIV — XVIII стст. згадваецца вялікая колькасць печаў, аблямаваных кафляй.

Першыя кафлі нагадвалі звычайныя гаршкі альбо невялікія макацёры, таму і атрымалі назву «гаршковыя». Ганчары выраблялі іх разам з кухонным ці сталовым посудам і нават спачатку мецілі некаторыя экземпляры звычайнымі ганчарнымі клеймамі. На Беларусь кафля трапіла, відаць, непасрэдна з Германіі — радзімы еўрапейскага кафлярства. Не выпадкова, што першыя вядомыя нам экземпляры, якія датуюцца 1308 г., знойдзены ў княжацкіх харомах Полацка (на тэрыторыі Верхняга замка), вядомага сваімі сувязямі з ганзейскімі гарадамі, у Лідскім і Крэўскім замках, узведзеных у 1-й палове XIV ст. Існуюць таксама пісьмовыя крыніцы, якія сведчаць, што ў пабудове гэтых замкаў маглі браць удзел майстры з ганзейскіх нямецкіх гарадоў. З гэтага часу глінабітныя печы, якія ўяўлялі сабою невысокія скляпеністыя збудаванні з асобнымі ўмураванымі ў іх цела гаршковымі кафлямі, уваходзяць у інтэр'еры драўляных і мураваных пабудоў.

Печ выглядала як купалок, злеплены з гліны на драўляным ці сплеценым з лазы каркасе. Скляпенне печы знаходзілася на глінабітным цокалі, умацаваным камянямі або бітай цэглай [1]. Гэта пацвярджаецца нашымі раскопкамі ў Лідскім і Мірскім замках. Знойдзеныя там поды печаў з гліны, бітай цэглы і дробных камянёў маюць невялікія памеры (каля 1 кв. м.). Цэлую печку такога тыпу знайшлі некалі ў вёсцы Крошын Баранавіцкага раёна. Яна была авальнай формы, зробленая з гліны і аздобленая кафляй з чатырохпялёсткавым вусцем [2].

Аднак існавалі печы і большых памераў. Іх рэканструкцыю на аснове раскопак П. Рапапорта княжацкага палаца ў Полацку прапанаваў Ю. Заяц. Адна з печак была зроблена на падушцы з вільготнай гліны таўшчынёю 10 — 12 см, у аснове якой на прадольнай пячной восі былі пакладзены чатыры бервяны. Шырыня падушкі магла дасягаць 3,5 м. Зверху была

зроблена надзейная платформа для печы. У яе аснову таксама пакладзены тонкія бярвёны, а сама яна выкладзена з чырвонай гліны і кепска абпаленай брусковай цэглы. Даўжыня яе — 2,25 м, шырыня — 2,5 м. Звонку печ абмазалі глінянай рошчынай шэрага колеру, таўшчыня абмазкі каля 3 см.

На гэтую платформу паставілі под печы памерам 0,8 х 1,7 м. Чалеснікамі (вусцем) печ была павернута на ўсход. Яна мела невысокія прамыя сценкі, якія плаўна пераходзілі ў скляпенне. Таўшчыня сценак — прыблізна 40 см. Асноўная частка печы мела памеры каля 2,1 х 1,6 м. Кафлю ў такой печы не клалі суцэльнымі шэрагамі, а ўмуроўвалі ў сценкі і скляпенне печы асобна. Гэта стварала шэрагі ў паралельным або шахматным парадку [3].

Пастулова верхняя частка кафлі, так званае вусце, што нагадвае звычайны круг, пачынае набываць розны выгляд: чатырохпялёсткавай, значна радзей трохпялёсткавай разеткі, потым квадрата, які часамі, у XV — пачатку XVI ст., закрываўся дэкаратыўнай, зробленай з гліны, праразной рашоткай. Кавалкі такіх кафляў з вусцем, аздобленым ляпнінай у выглядзе складанага геаметрычнага ўзору, знойдзены ў Полацку. Такая кафля называецца «кратавай», бо гліняная рашотка нагадвае каваныя краты.

Вялікая колькасць аналагічных кафляў XVI ст. знойдзена падчас раскопак Клецкага замка. Тэхналогія вырабу такіх кафляў была даволі складаная. Спачатку на ганчарным крузе фарміраваўся невялікі (16 см вышынёю) гаршчок з чатырохкутнім вусцем. Адначасова драўляным штампам на глінянай пласціне адбіваўся неабходны малюнак. Потым нажом кафляр прарэзваў адтуліны ў малюнку ці дапрацоўваў яго асобныя дэталі. Затым вонкавая пласціна прылеплівалася да ніжняй гаршковай часткі, і выраб абпальваўся. У Клецку знойдзены тры тыпы праразной, альбо так званай ажурнай кафлі з геаметрычным і раслінным арнаментам, а таксама з выявамі людзей у строях, уласцівых для ВКЛ і Польшчы ў XVI ст.

Пераход да кафлі з квадратным вусцем, які адбыўся ў XV ст., дазволіў рабіць кафляныя печы складанай канфігурацыі, значна павялічыць іх цеплааддачу за кошт павелічэння цеплавой печы. У канцы XV — пачатку XVI ст. для аздаблення сталовага посуду пачынаюць ужываць зялёную паліву, якая адначасова выкарыстоўваецца і для пакрыцця ўнутранай па-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

верхні гаршковай кафлі, што робіць яе новым дэкаратыўным элементам ва ўпрыгожанні інтэр'ераў жылых дамоў.

У гэты ж час у самых вялікіх цэнтрах кафлянай вытворчасці пачалі паступова пераходзіць да вырабу каробкавай кафлі, якая мела дэкаратыўнае прызначэнне, бо несла на сваёй вонкавай пласціне які-небудзь малюнак.

Але працэс замяшчэння гаршковай кафлі каробкавай у Беларусі адбываўся вельмі павольна, і таму ўсё XVI стагоддзе шырока ўжывалася гаршковая кафля. Існавала яна і ў пазнейшыя часы.

Так, развал печы, складзенай з гаршковай кафлі з круглым, квадратным і чатырохпялёсткавым вусцем, знойдзены ў Мірскім замку ў слаях канца XV — пачатку XVI ст. Под печы, зроблены з гліны і дробных камянёў, мае невялікія памеры (каля 1 кв. м). Мяркуючы па аналагах, сама печ уяўляла сабой гліняны купалок на драўляным або сплеценым з лазы каркасе. У глінянае скляпенне печы ўстаўлялася гаршковая кафля днішчам да агню, а вусцем — у памяшканне. Тоўстыя сценкі кафлі добра захоўвалі цяпло, якое ішло з глыбокіх кафляў-гаршкоў. Такім чынам, гаршковая кафля ў асноўным выконвае ролю каларыфера. І толькі з канца XIV ст., калі форма яе вусця паступова змяншаецца, яна пачынае набываць і дэкаратыўную функцыю.

Цікава, што цеплавое люстэрка мірскай печы складала кафля адной вышыні, але з рознымі па форме вусцямі. Больш за ўсё знойдзена кафлі з круглым вусцем. Яе вышыня — 14 см, дыяметр днішча — 10,5 см, дыяметр вусця — 14 см, таўшчыня сценак — 1 см. Шмат печаў канца XVI ст. з вялікай колькасцю невялікіх гаршковых кафляў з квадратным і круглым вусцем выяўлены пры даследаванні Крэўскага замка. З'яўленне рэльефнай каробкавай кафлі змяніла і форму кафлянай печы. Яна павялічваецца ў памерах і становіцца аздобай жылога памяшкання. У Германіі ўжо ў сярэдзіне XV ст. у інтэр'еры вялікую ролю набываюць кафляныя печы.

У XVI ст. у Беларусі рабілі камбінаваныя печы, дзе ніжні ярус складаўся з міскавай кафлі, а верхні — з каробкавай. Развал такой печы сярэдзіны — 2-й паловы XVI ст. мы знайшлі на тэрыторыі Лідскага замка. Печка мела прамакутны ў плане под памерам 1,6 х 1,4 м, зроблены з камянёў і бітай цэглы на гліне. Захаваўся след ад слупа, на якім, вера-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

годна, трымалася канструкцыя печы. Гэта адтуліна глыбінёю 50 см і дыяметрам 20 см. Рэшткі такой самай камбінаванай печы сярэдзіны XVI ст. мы адкапалі ў Мазыры. Магчыма, падобныя печы былі ў Заслаўскім замку [4].

У 1-й чвэрці XVI ст. на Беларусі пашыраецца зялёнапаліваная і шматколерная паліхромная кафля. Найбольш раннія паліхромныя кафлі знойдзены падчас раскопак у Друі і на замчышчы каля вёскі Гарадок Маладзечанскага раёна. Тут выяўлена вялікая колькасць кафлі з выявамі раслін, жанчын, сцэн палявання. Не мае аналагаў вялікая сцянная кафля з выявай амура.

Для аздаблення вонкавых пласцін кафлі ўжываюцца розныя варыянты старажытнага геаметрычнага арнаменту: квадраты, выпуклыя ці ўвагнутыя авалы або разеткі, салярныя знакі. Гэтыя запазычаныя са старажытнага народнага мастацтва сімвалы выкарыстоўваліся не толькі ў кафлярстве. Іх шмат у народнай разьбе па дрэве, вышыўцы на адзенні, нават у архітэктуры. Так, аздабленне аднаго акна старажытнай царквы ў Коўне (1530 г.) вельмі нагадвае звычайную, толькі павялічаную ў памерах кафлю.

З'яўляецца сюжэтная кафля з рознымі алегарычнымі або міфалагічнымі сцэнкамі. Вялікая калекцыя такой кафлі знойдзена пры раскопках Мядзельскага замка. У замку выяўлена і шмат паліхромнай кафлі, каляровая гама якой, відаць, была запазычана ў заходнееўрапейскіх майстроў. З'яўленне ў 1-й палове — сярэдзіне XVI ст. на Беларусі шматколернай керамікі, несумненна, вынік творчых «вандровак» беларускіх кафляроў у Італію, Паўднёвую Германію і Чэхію.

Самыя першыя каробчатыя кафлі, знойдзеныя ў Мірскім замку, датуюцца па даных стратыграфіі і аналагах сярэдзінай — 2-й паловай XVI ст. Гэта зялёнапаліваныя і тэракотавыя экземпляры з масіўнай румпай. Яны маюць паглыбленую вонкавую паверхню і ўпрыгожаны геаметрычным арнаментам. Вонкавая паверхня аднаго экземпляра мае разетку буйнога рэльефу. Найбольшую цікавасць выклікае фрагмент непаліванай кафлі з выявай Св. Юрыя (Георгія) на кані, які забівае цмока. Гэта адна з самых ранніх выяў такога тыпу, выказаных у рэнесанснай тэхніцы.

З 1568 года гаспадарамі замка сталі Радзівілы, якія ў канцы XVI — пачатку XVII ст. дабудоўваюць яго, узводзяць трох-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павярховы палац і розныя гаспадарчыя і службовыя памяшканні, якія ўжо ў канцы XVI ст. мелі кафляныя печы. Пісьмовыя крыніцы XVII ст. сведчаць пра багатае ўбранне палаца, які ацяплялі шыкоўныя печы, зробленыя з паліхромнай кафлі. У час шведскіх нападаў (1655 і 1706 гг.) палац шмат разоў гарэў і разбураўся. Таму ў 2-й палове XVII — пачатку XVIII ст. старыя печы паступова разабралі і зрабілі новыя з зялёнай паліванай кафлі [5].

Асноўная частка ўсіх кафлін датуецца канцом XVI — 1-й паловай XVII ст. — часам найбольшага росквіту Мірскага замка. Прычым час бытавання некаторых з іх можна дакладна вызначыць па датах, якія на іх маюцца. Так, напрыклад, у калекцыі ёсць датаваная 1583 годам кафля-каронка. Яна знойдзена побач з паўночнай сцяной замкавага корпуса разам з двухзубым відэльцам, белаглінянай люлькай галандскага тыпу (ранняга) і шэрагам рэчаў канца XVI — 1-й паловы XVII ст. Гэта сведчыць аб тым, што на той час паўночны корпус палаца, які пабудавалі Радзівілы, ужо дзейнічаў.

Усю калекцыю кафлі можна падзяліць на тры вялікія групы: непаліваную, зялёнапаліваную, паліхромную. З іх найбольшую цікавасць уяўляюць паліхромныя кафлі. Першыя паліхромныя печы зроблены падчас будаўніцтва замкавага палаца ў канцы XVI ст. Матэрыялы даследавання паказваюць, што ў замку ўжо тады існавала вялікая колькасць печаў розных памераў і прызначэння: вялікія і малыя, шарападобныя, выступаючыя ў памяшканне і прыціснутыя да сцяны, кутнія ці пастаўленыя пасярэдзіне, поўнасцю размешчаныя ў пакоі і тыя, што часткова выходзілі ў другое памяшканне. Тут былі печы кухонныя і ацяпляльныя, складзеныя з кафлі тэракотавай, паліванай зялёнай глазурай, і паліхромнай. Простыя печы, найбольш таннейшыя, з цэглы і тэракотавай кафлі будаваліся ў службовых памяшканнях, сутарэннях і на першым паверсе. Печы з зялёнай паліванай кафлі, відаць, былі прызначаны для святліц на другім паверсе. Печы ж з шыкоўных паліхромных кафляў ацяплялі толькі пакоі ўладароў замка на другім і трэцім паверхах.

Аб паліхромных печах Мірскага замка (пра іх знешні выгляд, агульныя памеры, тэматыку выяўленчых матываў, іх мастацкае ўздзеянне на прасторавае асяроддзе пакоя) недакладна, але ўсё ж можна меркаваць па кафлях, выяўленых у час

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

археалагічных раскопак. Усяго знойдзена восем тыпаў палі-хромнай кафлі з рознымі іх варыянтамі. Кожнаму тыпу адпа-вядае характар дэкору, які, у залежнасці ад яго месцазнахо-джання ў люстэрку печы, надаваў патрэбную трактоўку агуль-наму сюжэту.

Найбольшую колькасць сярод знойдзеных тыпаў склада-юць «сцянныя» квадратныя кафлі з бокам 20 см і ганчарнай румпай даўжынёй каля 7 — 9,5 см. Дэкор на іх двух відаў — раслінны і геральдычны. Шырэй прадстаўлены раслінныя, у нізкім рэльефе, арнаментальныя матывы, падпарадкаваныя чатырохбаковай сіметрыі. Фон кафлі — цёмна-сіні, парасткі, кветкі і лісце — белыя, дробныя дэталі — жоўтыя, рамка па краях — жоўта-зялёная. Раслінны арнамент стылізаванага лісця і кветак (яго ўмоўна можна назваць «агурковым» з-за падабенства з агурочнікам) шырока распаўсюджаны не толькі ў Міры, дзе гэты від малюнка ёсць на тэракотавых і зялёных паліваных кафлях у замку і мястэчку. Яго інтэрпрэтацыі шырока вядомы ў Мінску, Лідзе, Полацку, Мсціславе і іншых беларускіх гарадах і сведчаць аб мясцовым паходжанні.

Выява на геральдычнай кафлі ўяўляе сабой фамільны герб Радзівілаў. На жоўтым фоне — аднагаловы цёмна-карычневы арол — сімвал сілы і ўлады. Распрасцёртыя крылы і шырока расстаўленыя ногі з кіпцюрамі строга сіметрычныя. На грудзях — сіні шчыт з паляўнічымі рагамі — напамінак пра паходжанне ад простага паляўнічага. З краёў кафлі акрэслены жоўта-зялёнай рамкай. Агульны каларыт яркі, кідкі. Другой цікавай разнавіднасцю паліхромнага малюнка з арлом з'яўляецца кафля пазнейшага часу, большая па памерах, прамакутная. Карычневы арол на белым фоне ў кіпцюрах трымае лаўровыя галінкі. У Мірскай калекцыі маецца 6 тыпаў кафлін з выявай арла. Сустракаліся зялёнапаліваныя, тэракотавыя і паліхромныя фрагменты.

Да канца XVI ст. можна аднесці буйнарэльефныя кафлі, упрыгожаныя геральдычным арнаментам. Кафлі з Радзівілаўскім гербам выраблялісь, верагодна, па спецыяльнай замове і аналагаў на Беларусі амаль не маюць.

Цікава, што ў мястэчку знойдзена толькі 20 фрагментаў кафлі з выявай герба Радзівілаў, у той час як у замку знаходак кафляў з арлом на вонкавай пласціне налічваюцца сотні. Магчыма, што ў мястэчку такая кафля з гербам уладальніка

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

замка аздабляла печы ў афіцыйных будынках (ратуша) або ў шпіталі, які быў падораны гораду Радзівілам. Геральдычныя кафліны 1-й паловы — сярэдзіны XVII ст. выкананы ўжо ў іншай тэхніцы: рэльеф дробны, на галаве арла з'яўляецца карона, часам арол закампанаваны ў круг.

Калі аналізаваць суадносіны знаходак тэракотавых, зялёнапаліваных, паліхромных кафлін на тэрыторыі замка, то можна здагадацца, якія печы былі ў яго розных памяшканнях. Так, у раскопах побач з паўднёвай сцяной замка, дзе былі гаспадарчыя прыбудовы, сабраны толькі зялёнапаліваныя і тэракотавыя асобнікі, прычым апошніх было значна больш. У раскопах каля перадбрам'я сустракаліся розныя тыпы кафлі, у тым ліку і паліхромныя фрагменты. Найбольшая колькасць паліхромных кафлін была сабрана каля паўночнай сцяны замка, дзе быў размешчаны паўночны корпус Радзівілаўскага палаца.

Па функцыянальным прызначэнні пячная кафля падзяляецца на кафлі-каронкі, кафлю паясковую і гзымсавую, сценную кафлю як поўнага фармату, так і паліванага, кутнія кафлі, а таксама керамічныя медальёны і дахоўку для пакрыцця верху печы. Паясковыя і гзымсавыя кафлі таксама сустракаюцца як звычайныя, так і кутнія.

У Мірскім замку знойдзены спецыяльныя кафлі-медальёны, якія маглі выкарыстоўвацца не толькі для аздаблення печаў, але і для ўпрыгожання сцен у магнацкіх пакоях. Вось які падаецца інвентар 1621 года аднаго з пакояў удавы ваяводы Хрыстафора Зяновіча ў маёнтку Смаргонь: «У гэтым пакоі — 9 вокнаў з гербамі. У кожным акне па 4 створкі, з завесамі, кручкамі і пабеленымі прутамі... Уздоўж сцен — лавы. Уся столь размалявана markdownрознымі фарбамі... Пасярод пакоя два пазалочаныя падсвечнікі... Гэтыя абодва падсвечнікі падвешаны на пабеленых ланцугах. Печка з рознакаляровай кафлі з гербамі яго міласці і комінам. Вакол усяго гэтага пакоя жалезнымі цвікамі прыбіта драўляная панель. Увесь пакой, а таксама і лавы абцягнуты чорным сукном...» [6].

Сценныя кафлі ў час пабудовы паліхромнай печы клалі не роўна адну на адну, а так, каб другі вышэйшы рад клаўся ад сярэдзіны кафлі ніжэйшага рада, што стварала натуральны «замок» і павышала трываласць.

Завяршалі куты печы кутнія кафлі. Яны састаўляліся з цэлай сценкі і палавінкі, змацаваных пад прамым вуглом рум-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пай. Дэкор, як правіла, заставаўся той жа, што і на сценных кафлях — раслінны і геральдычны.

Падкрэслівалі прапорцыі аб'ёму печы кафлі паясковыя, рэльефы якіх мелі адцягнены міфалагічны змест. У іх матывах пераважаюць сярэдневяковыя алегорыі: над лістамі-цмокамі, якія сімвалізуюць злыя варожыя сілы, ганарова ўздымаецца арол — герб князя, асобна вынесены на кафлю-медальён. Размяшчалася яна, відаць, у самым цэнтры.

Зусім новы змест нясуць кафлі гзымсавыя, якія служылі сувязнымі пераходнымі формамі паміж рознымі аб'ёмамі печы. Сюжэты на гэтых кафлях міфалагічнага, расліннага, рэлігійнага характару. Яны раскрываюць тэму мары аб шчасці, славе, лёсу. Аб гэтым сведчаць букеты, перавітыя гірлянды, ланцужкі дубовага лісця на кафлях-каронках і «гарадках» уверсе печы. Асабліва цікавая кафля-каронка з букетамі і лічбай 1583. Яна, магчыма, сведчыла аб заканчэнні будаўніцтва паўночнага корпуса і яго інтэр'ераў.

Верх печаў перакрывалі кафлі-дахоўкі з тыповым і распаўсюджаным малюнкам «рыбінай лускі». Аналагічная кафля, толькі непаліваная або пакрытая зялёнай палівай, знойдзена ў Лідскім замку.

Усе тыпы кафляў набіраліся ў розных камбінацыйных варыянтах, дзе колькасць і іх месца былі абумоўлены памерам памяшкання і відам печы. Ад гэтага залежаў і агульны колер печаў. Калі вонкавае люстэрка печы набіраецца з кафлі, аздобленай расліннымі матывамі з пераважна сінімі фарбамі, то каларыт гучаў у халоднай, спакойнай гаме. Калі ж ужываліся выявы з цёмным арлом, дзе было шмат жоўтага светлага фону, то гэтая гама гучала ўжо кантрастна, узбуджана, трывожна і разам з тым сцвярджальна.

Па аналогіі з печамі Вавельскага замка ў Кракаве можна лічыць, што печы Мірскага палаца па форме былі падобныя на познеготычныя вежы: унізе — двух'ярусны квадрат або прамакутнік, а над ім — купал, аздоблены спецыяльнай кафляй-дахоўкай з малюнкам «рыбінай лускі» [7].

Вельмі цікавыя кафляныя печы былі ў пакоях Гродзенскага замка. З XVI ст. звесткі пра шматлікія кафляныя печы розных тыпаў неаднаразова згадваюцца ў пісьмовых крыніцах. Упершыню кафляныя печы ў пабудовах на тэрыторыі Старога замка згадваюцца ў «Пісцовай кнізе Гродзенскай эканоміі...», на-

пісанай у XVI — XVII стст. Гэтая надзвычай цікавая пісьмовая крыніца ўтрымлівае звесткі пра наяўнасць у тагачасным замку больш за тры дзесяткі кафляных печаў. Ёсць згадкі пра зялёную паліваную кафлю, а таксама пра «печы белыя» або «печы кафлі белай». Калі кафлі, пакрытыя белай палівай, з'яўляюцца ў значнай колькасці толькі ў XVIII — XIX стст., дык гаворка, відаць, ідзе пра печы са звычайнай тэракотавай кафлі, якая потым была пабелена. Дарэчы, непаліваную кафлю са слядамі пабелкі мы сустракалі не адзін раз у час раскопак у розных гарадах Беларусі.

Цікава зазначыць, што ў адным з будынкаў Гродзенскага замка знаходзілася печ «віленскай работы» [8]. Мяркуючы па назве, можна думаць, што яна была аблямавана дарагой паліхромнай рэльефнай кафляй, зробленай па спецыяльнай замове віленскімі майстрамі. Таму не выпадкова некаторыя віды паліхромных кафляў, знойдзеныя намі побач з палацам Стэфана Баторыя, не маюць аналагаў у іншых беларускіх гарадах і замках.

Гартаючы старонкі «Пісцовай кнігі...» можна атрымаць звесткі наконт канструкцыі кафляных печаў. Былі печы з зялёнай кафлі на чатырох слупках з арэхавага дрэва, печы з комінам, белая круглая печ, а таксама печ з уладкаваным у яе катлом.

Росквіт кафлянай вытворчасці ў г. Гродна прыпадае на 2-ю палову XVI — XVII ст. Сярод знаходак вылучаецца кафля ад розных частак кафляных печаў: сценная, кутняя, паясковая і каронкі. Найбольш пашыраная зялёнапаліваная і паліхромная кафля. Непаліваных экземпляраў знойдзена няшмат. На падставе сабраных матэрыялаў мы змаглі зрабіць некалькі рэканструкцый кафляных печаў гэтага часу.

Самай цікавай з усёй калекцыі з'яўляецца паліхромная кафля канца XVI ст., упрыгожаная разнастайнымі тыпамі арнаменту. Магчыма, да адной з печаў XVI ст. мы маем цэлы пячны набор розных па канструкцыі кафляў. Гэтая печ некалі аздабляла палац Стэфана Баторыя.

На наш погляд, адной з самых унікальных знаходак з'яўляюцца фрагменты квадратнай кафлі канца XVI ст. Цэнтр яе займае профільная выява чалавека ў лаўровым вянку, заключаная ў двайную круглую рамку, унутраны край якой заканчваецца шэрагам аднолькавых петляў. У ніжніх кутах кафлі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаходзяцца выявы двухгаловых арлоў, у верхніх — ільвоў з пышнымі грывамі і доўгімі хвастамі, паміж імі змешчана карона як сімвал каралеўскай улады. Спалучэнне белага рэльефу з сінім колерам дае непераўзыдзены эффект і аказвае высокае эмацыянальнае ўздзеянне. Памеры кафлі 19 х 19 см, вонкавая пласціна даволі тонкая. У калекцыі маецца цэнтральная частка кафлі такога ж тыпу, але профільная выява караля павернута ў другі бок. Па характары малюнка бачна, што драўляныя формы рабіліся хутчэй за ўсё рознымі майстрамі. Трэба адзначыць, што аналагаў такой кафлі на тэрыторыі Беларусі пакуль што не знойдзена.

Вельмі рэдкай знаходкай з'яўляецца і фрагмент паясковай кафлі, які мы ўмоўна назвалі «пасвячэнне ў рыцары». На ёй — выявы двух людзей у рэнесансным адзенні, адзін з іх стаіць тварам да нас, другі прыпаў на адно калена, у руках трымае корд, альбо меч. Тонкая прапрацоўка дэталей адзення, твараў, прычосак, атрыбутаў, рэалістычны малюнак з добрым веданнем прапорцый чалавека — усё гэта, безумоўна, сведчыць аб высокім прафесійным узроўні майстра, які, відаць, быў немясцовага паходжання і запрошаны ў Гродна для выканання спецыяльнага заказу. Вышыня кафлі 11,5 см, рэльеф высокі, белага колеру на сінім фоне, які амаль не захаваўся, бо паліва адлушчылася з-за дрэннага счаплення з чарапком. Вонкавая пласціна мае сляды неаднаразовай пабелкі.

У паўночнай частцы Замкавай гары ў час расчыстак памяшканняў казематаў XVI — XVII стст. было знойдзена васемнаццаць кавалкаў паліхромнай кафлі, вонкавая пласціна якой аздоблена выявай букета ў вазоне. Складаная па форме кветка з выгнутымі лісткамі знаходзіцца ў прыгожай белай вазе з высокай шыяй і выгнутымі ў выглядзе лацінскай літары S ручкамі. Па краях вонкавай пласціны праходзіць высокая рамка шырынёй 1 см. Сама пласціна таўшчынёй 1,1 — 2 см мае форму, блізкую да квадрата (19 х 19,5 см). Квадратная румпа вышынёй 9 см мацавалася з дапамогай жгуціка сырой гліны, прыціснутага пальцамі, але не загладжанага. У дэкаратыўным аздабленні кафлі побач з глухімі палівамі — сіняй (фон) і белай — ужыта зялёная свінцовая глазура (кветка, лісты і рамка). Падобная кафля, але зялёная ці тэракотавая, знойдзена ў Лагойску, Лідскім, Крэўскім і Мірскім замках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новы штуршок у выпрацоўцы кафлі і асабліва аздабленні яе вонкавай пласціны дало мураванае будаўніцтва ў стылі барока, якое пашыраецца ў гарадах Беларусі з наступленнем Контррэфармацыі. У гэты час яно дасягае сваёй вяршыні. Кафляныя печы сталі важным элементам інтэр'ера. Яны мелі складанапрафіляваную барочную форму, якая будавалася з розных тыпаў кафлі. Асабліва багатымі і разнастайнымі былі арнаментальныя матывы. Атрымлівае развіццё і раслінны арнамент: з'яўляецца выява расліны з лісцем, пладамі і кветкамі, па-ранейшаму пашыраны матыў валошак. Апошні сустракаецца не толькі на кафлі, але і ў разьбе па дрэве, на слуцкіх паясах.

Для ранняга барока характэрна кафля з адбіткамі дат (замак у Гальшанах, Магілёў, Мінск) і выявамі чалавечага твару (так званыя маскароны). Верхнія часткі печаў у асноўным аздабляюцца каронкамі з геаметрычным узорам. Многія тыпы расліннага і геаметрычнага арнаменту, уласцівыя барочнай кафлі, шырока ўжываліся і ў іншых відах тагачаснага мастацтва — нават у свецкім партрэце ці на дэкаратыўных фонах праваслаўных альбо уніяцкіх абразоў. Да нас дайшлі малюнкі-праекты печаў XVII ст. з кафлі, аздобленай раслінным арнаментам. Трэба адзначыць, што шматлікія ўзоры, пабудаваныя па законах «чатырохчленнай сіметрыі», шырока ўжываліся да апошняга часу ў народнай вышыўцы і пры вырабе папяровых выцінанак.

У рукапісным аддзеле бібліятэкі Кіеўскага Сафійскага сабора беларускі гісторык Г. Галенчанка знайшоў унікальныя чарцяжы некалькіх варыянтаў коміна для цэнтральнага палацавага корпуса Нясвіжскага замка, што зроблены ў канцы XVI ст. італьянскім архітэктарам Бернардоні [9].

У канцы XVI — 1-й чвэрці XVII ст. шмат якія беларускія магнаты заказвалі кафлярам кафлю са сваімі родавымі гербамі і манаграмамі. Знойдзена паліхромная кафля з гербам Радзівілаў (Мірскі замак), Сапегаў (Гальшанскі замак), Сангушкаў (Смальянскі замак), а таксама шматлікай беларускай шляхты. У гэты час выраблялі і спецыяльныя кафлі-медальёны для аздаблення інтэр'ераў палацаў і шляхецкіх сядзіб.

У 2-й палове XVII ст. у беларускім кафлярстве адбываюцца пэўныя змены. Паступова з вонкавай пласціны знікае рамка. Арнамент набывае іншые гучанне. Закончаны ўзор цяпер складаецца не з адной, як раней, а з некалькіх кафляў. Больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

простай становіцца канструкцыя самой печы. У яе будове выкарыстоўваюцца галоўным чынам сценная, гзымсавая кафля і каронкі. Некалькі павялічваецца фармат вонкавай пласціны сценнай кафлі. Яна становіцца прамавугольнай. Для афармлення ніжніх вуглоў печы пачынаюць ужываць балясіны (Віцебск, Мінск). Часам будуюцца печы круглай, цыліндрычнай формы. Адна з такіх печаў да нядаўняга часу існавала ў Слоніме. Яна цалкам была складзена з кафлі, аздобленай малюнкам гронкі вінаграду.

Сярод арнаментальных матываў па-ранейшаму пераважае раслінны. Папулярныя варыянты — вінаградная гронка з парасткамі, галінкамі хмелю і іншых раслін. У 2-й палове XVII ст. прыкметна скарачаецца выраб паліхромнай кафлі. Усё часцей ужываецца камбінацыя з бела-сіняй палівы.

Адметная рыса познебарочнай кафлі — наяўнасць васьмівугольнай або авальнай рамкі на яе вонкавай пласціне. Часам у гэтай рамцы змяшчаецца выява ўзброеных воінаў ці святога Юрыя (Георгія) на кані, які дзідай забівае цмока. Найбольш цікавая кафля з гэтым сюжэтам — мсціслаўская. Малюнак займае ўсю паверхню вонкавай пласціны і мае шэраг дробных дэталей, уласцівых афармленню беларускай батлейкі. Такая трактоўка характэрна менавіта для магілёўскай школы культавага жывапісу. У XVIII ст. на Беларусі побач з рэльефнай ужывалася кафля з роўнай паверхняй.

Вялікую колькасць такой кафлі знайшлі падчас раскопак віцебскай ратушы. Віцебская кафля аздоблена выявамі розных пейзажаў, а таксама геаметрычна-раслінным арнаментам. Аналагічная кафля аздабляла ў XVIII ст. пакоі Старога замка ў г. Гродна. Да нашых дзён захавалася печка, аблямаваная распіcной кафляй канца XVIII — пачатку XIX ст. у былой шляхецкай сядзібе ў вёсцы Жамыслаў Іўеўскага раёна. Цэнтральная частка печы аздоблена кафлямі, на якіх пададзены розныя сцэны з побыту паляўнічых.

Незважаючы на ўплыў матываў класіцызму ў архітэктуры палацаў і сядзіб, іх інтэр'еры яшчэ доўгі час бачны рысы позняга барока і ракако. Заставалася імкненне праславіць асобу гаспадара, паказаць яго грамадска-эканамічны статус. Сцены інтэр'ераў напаўняюцца шматколернай скульптурай, ляпнінай, разьбой. Шырока выкарыстоўваліся мармур, крышталь, пазалочаная бронза. У каляровым вырашэнні інтэр'ераў перава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жалі пастэльныя тоны. Сцэны парадных залаў упрыгожвалі вялізнымі карцінамі, акантаванымі багата арнаментаванымі рамамі і багетамі.

Не саступалі гэтаму гучанню і кафляныя печы. У пачатку XVIII ст. паступова на замену рэльефным паліхромным кафлям прыходзіць размаляваная з гладкай паверхняй. Замена адбывалася паступова і ў некалькіх напрамках. З аднаго боку, традыцыйны рэльеф застаецца без змен, але каляровая палітра спрашчаецца, па белым фоне рэльеф размалёўваецца кобальтам. Потым рэльеф знікае, гладкую белую паверхню размалёўваюць сінім кобальтам, зялёнымі, жоўтымі і карычневымі эмалямі. Малявалі галінкі, кветкі, букеты. З іншага боку, рэльеф павялічваецца, пераходзячы ў гарэльеф і аб'ёмную скульптуру, якія ўпрыгожвалі куты печы, фрызы і цокаль, выкарыстоўваюцца балясіны, вітыя пілоны.

Пад уплывам класіцызму ўваходзяць у моду роўныя паверхні печаў у спалучэнні з высокім гарэльефам. Характэрныя асаблівасці — геаметрычнасць, ураўнаважанасць, падпарадкаванасць сіметрыі, выразна акрэсленыя профілі і дэталі. Акрамя раслінных матываў, галінак дуба ці лаўра, сплеценых у гірлянды, вянкі, букеты, з'яўляюцца геаметрызаваныя матывы — ромбы, разеткі, картушы.

У канцы XVII — пачатку XVIII ст. печы ў Мірскім замку і мястэчку пачалі абліцоўвацца бязрамачнай кафляй з дывановым арнаментам. У XVIII — пачатку XIX ст. печы ў Міры складаліся з гладкіх тэракотавых, зялёнапаліваных, пакрытых белай ці светла-блакітнай палівай сценных і прафіляваных гзымсавых кафлін без арнаменту. Па кутах размяшчаліся кутнія кафлі з вітымі балясінамі.

Асноўным элементам печы часоў класіцызму застаецца яе цэнтральная частка ў выглядзе картуша з намаляванай у ім жанравай сцэнай або пейзажам. Печы гэтага перыяду можна ўбачыць у пакоях Нясвіжскага замка.

У 2-й палове XIX ст., калі ўваходзіць у моду капіраванне мінулых стыляў — готыкі, рэнесансу, барока і інш., кафля губляе адзінства з архітэктурным асяроддзем, набывае фармалістычныя рысы, неапраўданую стракатасць.

Печы часоў мадэрна, новага стылю, які складваецца ў самым канцы XIX ст., маюць асіметрычнае рашэнне і абцякальную форму. На вонкавых пласцінах пануюць асіметрычныя

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

малюнкі, павойныя кветкі, балотныя і рачныя расліны, багавінне. Значна ўплывае на характар дэкору захапленне Усходам, асабліва японскім мастацтвам. Узбагачаецца палітра накрыццяў, ужываюцца новыя прыёмы нанясення дэкору, размалёўка па паліве. Пячное ацяпленне ў інтэр'ерах беларускіх замкаў дзейнічала да сярэдзіны XX ст.

*Літаратура*

1. Historia kultury materialnej Polski w zarysie. Wroclaw—Warszawa—Kraków—Gdańsk, 1978. T. 2. S. 314.

2. Gloger Z. Encyclopedia staropolska ilustrowana. Warszawa, 1972. S. 303.

3. Заяц Ю. А. О постройке с изразцовыми печами возле княжеского терема в Полоцке / Гісторыка-археалагічны зборнік. 1997, № 12. С. 94—95.

4. Заяц Ю. А. Заслаўская кафля. Мн., 1990. С. 21.

5. Иодковский И. И. Замок в Мире // Древности. Труды комиссии по сохранению древних памятников. Т. 6. М., 1975. С. 70.

6. Инвентари магнатских владений Белоруссии 17 — 18 вв.: Владение — Сморгонь. Мн., 1977. С. 24.

7. Piakiewicz-Dereniowa M. Rekonstrukcia dawnych Wawelskich pieców kaflowych / Biuletyn Historii sztuki. 1960. T. XXII. S. 331—332.

8. Писцовая книга Гродненской экономии с прибавлениями издания Виленской комиссии для разбора древних актов. Вильно, 1882. С. 18.

9. Габрусь Т. В. Архитектурное проектирование в Белоруссии: У истоков // Строительство и архитектура Белоруссии. 1990., № 4. С. 37—38.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ